**УДК 72.03(476)**

**Тамара Габрусь**

# Адметны тып драўлянага храмабудаўніцтва Беларусі

**Тамара Габрусь**

**Характерний тип будівництва дерев'яних храмів Білорусі**

Статтю присвячено архітектурно-стилістичному аналізу окремого типу храмового будівництва Білорусі, який раніше ніколи не виокремлювалося у вітчизняному мистецтвознавстві, – дерев'яних базилік. Поява архітектурного типу мурованої базиліки у сакральній архітектурі Великого князівства Литовського була наслідком кардинальних соціально-політичних змін, хрещення населення етнічної Литви в католицькому обряді 1387 року. Показано, як форма класичної латинської базиліки трансформувалася в новому будівельному матеріалі під впливом вітчизняної мурованої архітектури з вираженою ідеологічною програмою католицизму та естетичною концепцією стилю бароко. На підставі натурних досліджень та архівних джерел розглянуто низку пам'яток традиційного білоруського дерев'яного зодчества базилікального типу. Відображено активізацію нового етапу будівництва дерев'яних костелів типу базиліки, що відбулась у міжвоєнний період і проявилась у домінуванні архітектурних традицій у різних регіонах Польщі.

*Ключові слова*: класична базиліка, базилікальний розріз, естетична концепція бароко, професійне дерев'яне зодчество, відмітний архітектурний тип

**Tamara Gabrus**

**A typical type of construction of wooden temples of Belarus**

The article deals with the historic and architectural-stylistic analysis of the wooden basilical churches, a characteristic type of architecture in Belarus, which was never before distinguished as neither separate nor unique phenomenon in the local art-critical tradition. The appearance of the type in the sacral architecture of the Grand Duchy of Lithuania was a result of radical social and political changes, caused by the baptism in the Catholic rite of the ethnic Lithuanian people in 1387. The transformation of the architectonics of the traditional Latin stone church in the context of a new constructing material is shown. Also the correlation between

this transformation and a conceptual program of the Catholicism as well as the esthetic principles of the Baroque style is investigated. A number of monuments of the wooden basilical type of architecture based on live research and studies of the archival sources is explored. An intensive new construction period of the wooden basylical type churches, which occurred in between two World Wars and was marked by strong domination of Polish architectural tradition, is described.

*Keywords:* classical basilical church, basilical cut, esthetic concept of the Baroque, professional wooden architecture, characteristic architectural type

Асновай сучаснай класіфікацыі традыцыйных драўляных храмаў Беларусі з'яўляецца іх прынцыповы падзел паводле аб'ёмна-пpастopавых кампазіцый на два матрычныя тыпы: падоўжна-восевыя "клецевыя" (адна-, двух- і трохзрубавыя) і двухвосевыя "крыжовыя" (чатырох- і пяцізрубавыя) архітэктанічныя структуры. Такі падзел адзначаны ўжо ў старажытных інвентарах і ведамасцях. Гэтай жа класіфікацыі прытрымліваліся ў асноўным прадстаўнікі расійскай школы архітэктуразнаўства пры выяўленні генезісу матрычнага ўсходнеславянскага драўлянага храма, які ў далейшым набыў у розных народаў разнастайныя інтэрпрэтацыі. Даследчыкі ўкраінскага драўлянага храмавага дойлідства на гэтай аснове налічваюць каля 80 варыянтаў разнастайных аб'ёмна-кампазіцыйных вырашэнняў [1]. Аднак азначаная класіфікацыйная структура не ахоплівае адметную групу драўляных храмаў тыпу базілікі, даволі пашыраных у перыяд Вялікага Княства Літоўскага на тэрыторыі этнічнай Літвы і Беларусі.

У наш час тэрмін "базіліка" стаў намінацыяй, тытулам, які надаецца Папам Рымскім найбольш значным рымска-каталіцкім храмам незалежна ад іх архітэктурнага вырашэння. Латэранская базіліка ў Рыме з папскай катэдрай мае тытул "Архібазіліка", 6 буйнешых сабораў маюць тытул "Вялікая базіліка", 12, падпарадкаваных непасрэдна Папе, завуцца "Папскімі базілікамі", яшчэ тры – "патрыярхальнымі базілікамі". Звыш 1500 паломніцкіх святыняў маюць тытул "Малой базілікі". Але ў гэтым артыкуле гаворка пойдзе пра гістарычнае сутнаснае паняцце "базілікі" як

старажытнага тыпу збудавання, што мае адметную ўстойлівую архітэктоніку. У класічным варыянце гэта прамавугольны ў плане будынак, падзелены шэрагамі апор на няцотную колькасць падоўжных памяшканняў-наваў (тры ці болей), з якіх сярэдні больш шырокі і высокі за бакавыя і асвятляецца дадатковымі вокнамі ў верхняй частцы сцен. Азначаная аб'ёмна-прасторавая структура з характэрным markerознавышынным светлавым "базілікальным разрэзам" дазваляла рабіць надзвычай ўмяшчальныя і добра асветленыя збудаванні. Невыпадкова іх назвалі базілікамі – домам цара (ад наймення візантыйскага імператара – базілеўс), а пазней і домам Цара Нябеснага. Вынайдзеныя ў Старажытнай Грэцыі, затым запазычаныя Старажытным Рымам, у антычным свеце базілікі першапачаткова мелі свецкі характар і прызначаліся для паседжанняў судоў і гандлёвых суполак. Дзякуючы сваёй рэпрэзентатыўнасці і канструкцыйнай дасканаласці, з V ст. базіліка стала асноўным тыпам хрысціянскай архітэктуры лацінскага арэала. Раннехрысціянскія базілікі звычайна мелі драўляныя бэлечныя перакрыцці, якія ўпрыгожваліся прафіляванымі кесонамі. Пазней для перакрыцця травей атрымалі пашырэнне мураваныя крыжовыя скляпенні, спачатку даволі важкія, раманскія, затым, з XII ст., гатычныя, аблегчаныя разгрузачнымі рэбрамі-нервюрамі.

Мастацкі вобраз базілікі быў абумоўлены, у першую чаргу, яе архітэктонікай, паслядоўным рытмічным крокам апор і працяглай гарызанталлю даха. Таму ў хрысціянскай традыцыі яму была нададзена семантыка карабля альбо Каўчэга Выратавання. У кампазіцыі заходнехрысціянскай базілікі звычайна дамінавалі высокая цэнтральная нава і роўная з ёй па вышыні і шырыні папярочная нава (трансепт), якія ўтваралі ў верхнім сячэнні збудавання план у выглядзе выцягнутага крыжа, які ў гісторыі архітэктуры вызначаны як лацінскі. Упершыню гэтая кампазіцыя з'явілася пры будаўніцтве ў пачатку IV ст. н. э. на месцы антычнага цырка імператара Нерона раннехрысціянскай рымскай базілікі св. Пятра. Сяродкрыжжа, як і астатнія прасторавыя ячэйкі паміж апорамі,

перакрывалася крыжовым скляпеннем, а звонку акцэнтавалася востраверхім шатром. Купалы у раманскай і гатычнай архітэктуры, у адрозненне ад Усходняй Рымскай імперыі, не выкарыстоўвалі.

З'яўленне архітэктурнага тыпу мураванай базілікі ў сакральным дойлідстве Вялікага Княства Літоўскага было вынікам кардынальных сацыяльных зменаў, хрышчэннем насельніцтва этнічнай Літвы ў каталіцтва ў 1387 г., пашырэннем дзейнасці на тэрыторыі дзяржавы каталіцкіх жабрацкіх ордэнаў бернардзінцаў і францысканцаў. Першыя мураваныя базілікі гэтых законаў з'явіліся ў Вільні і Коўна і мелі выразныя рысы заходнееўрапейскай готыкі. На тэрыторыі сучаснай Беларусі ўзвядзенне першай мураванай базілікі – фарнага касцёла ў Гродна – фундаваў у 1574 г. кароль Рэчы Паспалітай Стэфан Баторы, які меў у гэтым горадзе каралеўскую рэзідэнцыю. Архітэктура гэтай святыні з магутнай вежай-вестверкам на галоўным фасадзе спалучала рысы мясцовай готыкі і італьянскага рэнесанса. Яе стваральнік італьянскі архітэктар Джавані Марыя Бернардоні, манах ордэна езуітаў, запрошаны з Рыма "некаранаваным каралём" Вялікага Княства Літоўскага князем М.-К. Радзівілам Сіроткам, у хуткім часе пабудаваў у Нясвіжы, цэнтры княжаскай ардынацыі, наступную велічную крыжова-купальную базіліку – касцёл Божага Цела (1587–1601 гг.), што стаў першым творам архітэктуры барока на тэрыторыі ўсёй Рэчы Паспалітай [2]. Па ўзору італьянскіх сабораў Новага часу, нясвіжскі касцёл езуітаў атрымаў вялізны купал на сяродкрыжжы, які дамінаваў над нізкай драўлянай забудовай мястэчка. Аднак неспрактыкаванасць мясцовых майстроў у справе ўзвядзення з цэглы купалоў вялікага пралёту, абрушэнне купала падчас будаўніцтва базілікі св. Казіміра ў Вільні прывялі да вельмі асцярожнага ўжывання іх на тэрыторыі ВКЛ. Таму на працягу XVII–XVIII стст., у эпоху панавання стылю барока, на беларускіх землях найбольшае пашырэнне атрымалі класічныя бязкупальныя базілікі (прамавугольныя альбо планам у выглядзе лацінскага крыжа). У перыяд ранняга барока каталіцкія базілікі Беларусі мелі

бязвежавыя галоўныя фасады, што выяўляе іх італьянскі генезіс. Але паступова ва ўзаемадзеянні з агульнымі заходнееўрапейскімі тэндэнцыямі і мясцовымі традыцыямі абарончага дойлідства пачаў фарміравацца барочны тып базілікі з дзвюхвежавым фасадам.

Пасля крывавай польска-шведска-рускай вайны сярэдзіны XVII ст., названай у народзе “патопам”, у сацыяльным жыцці Рэчы Паспалітай пашырылася ідэалогія сарматызма, саслоўнага шляхецкага патрыятызму, што адбілася на архітэктурных формах каталіцкага храмабудаўніцтва. Носьбітамі сармацкага светапогляду ў архітэктуры Вялікага Княства Літоўскага сталі “жабрацкія” каталіцкія ордэны, місіянерская дзейнасць якіх была скіравана, у першую чаргу, на сярэднія (“вольныя і можныя”) пласты грамадства – шляхту і заможных мяшчан, якія выступалі галоўнымі фундатарамі шматлікіх касцёлаў [3]. Сродкамі культурна-асветніцкай дзейнасці жабрацкіх законаў адбывалася пашырэнне каталіцызму сярод сялян, звыш 80% якіх на той час былі грэка-католікамі. Прынамсі на гэтым этапе адбылося творчае злучэнне этнічных прыёмаў драўлянага будаўніцтва з стылявымі характарыстыкамі прафесійнай мураванай каталіцкай архітэктуры таго часу, што на стагоддзі вызначыла самабытнасць беларускага драўлянага сакральнага дойлідства. У першую чаргу, гэта прывяло да стварэння найбольш пашыранага драўлянага храма клецевага тыпу базілікальнай канцэпцыі. Апасродкавана гэта выяўлялася ў аб’яднанні трох кананічных частак храма агульным дахам з падоўжным вільчыкам, што надавала збудаванню выгляд карабля. Адначасова непасрэднае і дакладнае ўвасабленне ў драўляным каталіцкім і грэка-каталіцкім храмабудаўніцтве Беларусі знайшлі вобраз і структура базілікі, шмат’яруснага карабля-каўчэга.

Кожная драўляная базіліка ў храмабудаўніцтве Беларусі вылучалася самабытнымі кампазіцыйнымі варыяцыямі: характарам вырашэння галоўнага фасада – з вежамі ці без іх, наяўнасцю ці адсутнасцю трансепта, яго вышынёй і характарам пакрыцця і г.д. Найбольш істотнай асаблівасцю для вызначэння тыпалогіі



*Іл. 1. Адэльск. Гродзенскі р-н. Касцёл Унебаўзяцця Дзевы Марыі. 1784*

базілікі з'яўляецца "базілікальны разрэз" – розная вышыня наваў ў сіметрычным папярочным сячэнні збудавання. У класічным варыянце ён павінен быць светлавым – з вокнамі ў верхняй частцы цэнтральнай навы. Але ў айчынных драўляных святынях тыпу базілікі дахі бакавых наваў часам падводзілі пад карніз цэнтральнай навы, што пакідала яе без верхняга асвятлення.

Найбольш характэрны ацалеўшы помнік тыпу класічнай базілікі касцёл Унебаўзяцця Дзевы Марыі ў в. Адэльск (Гродзенскі р-н) (*іл. 1*). Каталіцкая парафія заснавана тут у 1490 г. Першы драўляны касцёл пабудаваны ў 1601 г. па фундацыі караля Жыгімонта III Вазы. Існуючы касцёл пабудаваны ў 1784 г. [4]. Гэта класічная прамавугольная ў плане драўляная базіліка з трансептам, унутраным нартэксам і пяціграннным прэсбітэрыем. Будынак падзелены 10 слупамі на тры навы, вылучаныя аркадамі. Цэнтральная нава накрыта

вальмавым дахам і асветлена невялікімі круглымі люкарнамі. Вільчык над нартэксам прарэзвае васьмігранны барабан з фігурнай галоўкай-“банькай”. Вузкія і крыху больш нізкія бакавыя навы накрыты аднасхільнымі дахамі, якія працягнуты на сіметрычныя прыбудовы, што ўключаюць крылы трансепта і двухкамерныя сакрыстыі. Традыцыйная вертыкальная шалёўка сцен умацавана сцяжкамі-“лісіцамі”. Аконныя і дзвярныя праёмы маюць арачныя завяршэнні, у бакавых навах спараныя. Унутры над уваходам размешчаны музычныя хоры на 2 слупах.

У мястэчку Дзівін (Кобрынскі р-н), акрамя вядомай царквы Параскевы Пятніцы (былой уніяцкай), існаваў таксама больш ранні драўляны касцёл, заснаваны ў 1660 г. каралём Янам Казімірам Вазай. Паводле інвентара 1830 г., ён быў “фігуры падоўжна-квадратнай шырынёю 20 локцяў, даўжынёю 31 локаць, без прысценка і вежаў, толькі з купалам для сігнатуркі. Пакрыты дубовым гонтам, мае хор сталярскай работы, да якога вядуць добрыя сходы. Вокнаў 18, з іх 4 старыя. Мае 2 сакрыстыі. У адной печ і цагляны пол, з кратамі на вокнах, другая без печы. Сярэдзіна касцёла 4 слупамі драўлянымі падпёрта, стварае 2 бакавыя капліцы. Скляпенне з дошак хваёвых. Падлога ў квадрат пакаёвым спосабам укладзена, мае ў сабе жалеза для моцы. Склеп адзін пад вялікім алтаром стары, але яшчэ добры. 5 алтароў сталярскай і сніцарскай работы, белыя з золатам і серабром і жывапісам” [5]. З апісання вынікае, што гэта быў драўляны храм тыпу трохнававай базілікі з трансептам, перакрыты скляпеннем і з арміраванай паркетнай падлогай.

Каталіцкая парафія ў мястэчку Кабыльнік (б. Свянцянскі павет, цяпер г.п. Нарач Мядзельскага р-на) заснавана ў 1434 г. князем Андрэем Свірскім. Драўляны парафільяны касцёл св. Андрэя Апостала першапачаткова пабудаваны ў 1651 г., спалены падчас “нашэсця Масквы”, адбудаваны да 1678 г. Новы драўляны касцёл пабудаваны ў 1736 г. на сродкі тагачаснага ўладальніка маёнтка Марціна Аскеркі, каштэляна наваградскага, адноўлены пасля пажару 1862 г. коштам плябана Людвіка Мініцкага і шляхціца Тытуса Свентаржэцкага. у

1897–1901 гг. заменены новым мураваным храмам у неагатычным стылі. Выгляд драўлянага касцёла вядомы па гравюры А. Ромера 1880 г. [6]. Храм меў развітую аб'ёмна-прасторавую кампазіцыю трохнававай базілікі з трансептам і дзвюхвежавым галоўным фасадам. Святыня, паводле інвентара, была "немалых памераў", з трыма алтарамі і старажытным цудатворным абразом Маці Божай. Крылы трансепта, роўнай вышыні з бакавымі навамі, былі накрыты даволі высокімі чатырохсхільнымі гонтавымі шатрамі. Галоўны фасад меў шмат'ярусную будову, што надавала яму надзвычайны вертыкалізм і вытанчанасць, уласцівую віленскаму барока. Ніжні ярус аддзяляўся шырокім прычолкам на вышыні бакавых наваў, другі – на вышыні цэнтральнай навы. Вышэй ішоў атыкавы ярус з балкончыкам для музыкаў. Кампазіцыю фасада вянчалі трохвугольны франтон і чацверыкі вежаў з фігурнымі барочнымі завяршэннямі, якія спалучалі шатры і банькі. Зрубава-каркасная званіца, апярэзанная 2-ма паясамі гонтавых прычолкаў і завершаная гонтавым шатром-каўпаком, стаяла на паўднёвы захад ад касцёла (рэстаўравана ў 1925 і 1995 гг., гонт заменены бляшаным пакрыццём).

Каталіцкая парафія ў в. Ставы (Камянецкі р-н) заснавана ў 1461 г. Янам і Юрыем Стаўскімі. Драўляны касцёл Унебаўзяцця Дзевы Марыі і св. Іакава пабудаваны ў 1724 г., у 1739 г. асвечаны луцкім біскупам Ружыцкім. Не існуе. Паводле візіты 1935 г., будынак быў амаль разбураны, сцены "забраны лісіцамі", пакрыты гонтам [7]. Архітэктоніка храма імітавала класічную базіліку з прамавугольным планам. Аднасхільныя дахі бакавых наваў былі падведзены пад карніз двухсхільнага даха галоўнай навы, якая не мела бакавога асвятлення. На вільчыку даха рытмічна месціліся тры невялічкія сігнатуркі: над алтаром, у цэнтры і над галоўным фасадам. Па баках прамавугольнага алтара размешчаны выцягнутыя з ім у адну лінію невысокія сакрыстыі, пры уваходзе – экзанартэкс з двухсхільным дахам. Сцены былі ашаляваны вертыкальна дошкамі з нашчыльнікамі і ўмацаваны лапаткамі-"лісіцамі". Франтон

галоўнай навы меў дэкаратыўную шалёўку “у елачку”. Інтэр’ер, асветлены вялікімі арачнымі вокнамі, падзялялі 4 масіўныя слупы. Над уваходом месціліся хоры на 2-х слупках.

Касцёл Адшукання Св. Крыжа ў мястэчку Ляхавічы (цяпер горад, цэнтр раёна) пабудаваны ў 1745 г. і адноўлены пасля пажару ў 1750 г. князем Міхалам Масальскім, у 1863 г. перададзены праваслаўным. Не існуе. Вядомы паводле інвентара 1782 г. і кнізе А. Асяндоўскага “Палессе. Цуды польскія” [8]. Архітэктанічна ўяўляў класічную трохнававую двухвежавую базіліку з трохгранным завяршэннем прэсбітэрыя. Вузкі аб’ём фасада-нартэкса завяршаўся высокай атыкавай сценкай з трохвугольным франтонам і сіметрычнымі чацверыковымі вежамі з вытанчанымі двух’яруснымі фігурнымі “банькамі”. Сцены мелі вертыкальную шалёўку з арачным падзорам. Вокны цэнтральнай навы былі паўкруглыя, бакавых – прамавугольныя. Інтэр’ер святыні меў багатае ўбранне “сніцарскай работы”: разьбяныя з пазалотай алтары, табернаклі, канфесіяналы, бронзавыя жырандолі. Цікавасць уяўляла асобна пастаўленая трох’ярусная званіца, якая мела ніжні чацверыковы ярус з шырокім прычолкам, над ім даволі масіўны глухі васьмерык, завершаны скразным ярусам і вялікім самкнёным купалам.

Драўляны касцёл езуітаў св. Станіслава Косткі ў Ваўкавыску пабудаваны ў 1760–1770-я гг. Меў тэктоніку класічнай базілікі. Паводле люстрацыі 1793 г., будынак меў “2 вежы на фасадзе і трэцяю маленькую над галоўнай навай, крыты гонтам, а купалы з бляхі. Уваход праз крухту, над ёй хоры. Сакрыстыі з абадвух бакоў. Падмурак цагляны, пад ім склеп. Вокнаў на 1-м ярусе вялікіх – 11, на другім, які ад першага аддзяляўся балясамі ўнутранымі, вокнаў меншых вакол касцёла і на хорах – 13” [9]. З гэтага апісання вынікае, што будынак касцёла меў архітэктоніку базілікі.

Каталіцкая парафія ў мястэчку Койданава (г. Дзяржынск) існавала з 1493 г. Акрамя мураванага кальвінскага збора, пазней перабудаванага ў касцёл Міхаіла Арханёла, тут быў драўляны парафіяльны драўляны касцёл Апекі Божай, пабудаваны ў 1768 г.

Трохнававы храм з 2-вежавым фасадам-нартэксам меў надзвычай маляўнічыя познебарочныя абрысы франтона і завяршэнні чацверыковых вежаў.

Касцёл Адшукання Святога Крыжа ў в. Груздава (Пастаўскі р-н) заснаваны ў 1529 г. У 1773 г. пабудаваны новы храм ў выглядзе трохнававай двухвежавай базілікі. Істотна перабудаваны на мяжы XIX–XX стст., набыў рысы неаготыкі. Выгляд вядомы паводле фотаздымка Я. Балзункевіча.

Драўляны парафіяльны Троіцкі касцёл у Драгічыне пабудаваны ў 1773 г. у стылі позняга барока. Вядомы паводле архіўных матэрыялаў [10]. Уяўляў класічную трохнававую базіліку з двухвежавым фасадам-нартэксам. Чацверыковыя вежы мелі двух'ярусныя фігурныя купалы-"банькі". Яшчэ адна "банька" месцілася над прэсбітэрыем, выяўляе сімволіку Святой Тройцы. Паміж вежамі знаходзіўся "свабодны" франтон з шырокім прычолкам. Сакрыстыі былі ўбудаваны унутры бакавых наваў, тарцовыя грані якіх скошаны да алтарнай сцяны. Пры ўваходзе прыбудаваны невысокі квадратны ў плане бабінец, накрыты пакатым шатром-"каўпаком". Сцены мелі вертыкальную шалёўку з нашчыльнікамі і сцяжкамі-"лісіцамі". Інтэр'ер быў падзелены 6 слупамі, над уваходам месціліся хоры.

Касцёл Адшукання Святога Крыжа ў мястэчку Ўзда (цяпер гарадскі пасёлак) пабудаваны ў 1798 г. па фундацыі Казіміра Завішы. Цяпер выкарыстоўваецца як раённы Дом культуры. Архітэктанічна з'яўляецца трохнававай крыжовай базілікай лацінскага тыпу (цэнтральны неф і трансепт утвараюць ў плане на ўзроўні карніза выцягнуты лацінскі крыж). Уваходная частка вырашана вузкім аб'ёмам нартэкса, распластанага па шырыні базілікі, раней завяршалася атыкам і двума чацверыковымі вежамі. Пры перабудовах у XIX і XX ст. да нартэкса прыбудаваны чатырохкалонны мураваны порцік, а да алтарнай часткі – трохгранная мураваная апсіда, зменена канструкцыя дахаў і шалёўка. Унутраная прастора падзелена 12 мураванымі калонамі

з вылучэннем наваў, сяродкрыжжа і музычных хораў, на якіх раней быў арган на 11 галасоў. На алтарнай сцяне знаходзілася оптычная размалёўка з выявай барочнага алтара. Паводле вобразна-кампазіцыйнага вырашэння помнік мае агульныя рысы з касцёлам Міхаіла Архангела ў Цімкавічах Капыльскага р-на, што з прычыны іх рэгіянальнай блізкасці дазваляе гаварыць аб лакальнай школе драўлянага храмабудаўніцтва.

Каталіцкая парафія ў Цімкавічах (Капыльскі р-н) заснавана ў 1560 г. князем Янам Сымонам, сынам Юрыя І Алелькі, уладальніка ўдзельнага Слуцкага княства. У 1580 г. пабудаваны першы драўляны касцёл асвечаны ў гонар Міхаіла Архангела біскупам віленскім Юрыем Радзівілам. У 1647 г. на яго падмурку пабудаваны новы касцёл па фундацыі падканцлера літоўскага Казіміра Льва Сапегі. Пазней будынак касцёла неаднаразова аднаўлялі, асабліва істотна ў пачатку XX ст., пасля Вялікай Айчыннай Вайны прыстасаваны пад праваслаўную царкву. У 1970-я гг. помнік даследаваўся экспедыцыямі Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклора АН БССР, зроблены яго абмеры і фотафіксацыя, але ў 1986 г. храм знішчаны пажарам. Аб’ёмна-прасторавая кампазіцыя будынка імітавала ў дрэве трохнававую базіліку з трансептам і вызначалася цэласнацю і маналітнасцю форм. Вялікі прамавугольны ў плане асноўны зруб падзяляўся двума радамі круглым калон (усяго іх было 10) на тры навы, сярэдняя з якіх была вышэй і ўтрая шырэй за бакавыя. Звонку ўсе навы былі накрытыя агульным высокім гонтавым дахам з вальмамі над трохгранным завяршэннем прэсбітэрыя. Такім чынам, галоўная нава была пазбаўлена верхняга асвятлення, за выключэннем алтарнай часткі, якую апярэваў прычолак на узроўні карніза бакавых нефаў. Дапаможныя памяшканні (сакрыстыі, хрысцільня, лесвіца на хоры) размяшчаліся па вуглах асноўнага аб’ёму і не выступалі за лінію фасадаў. Дзве сіметрычныя невысокія прыбудовы з самастойнымі двухсхільнымі дахамі па баках алтарнай часткі

імітавалі трансепт і надавалі плану выгляд лацінскага крыжа, але не былі адкрытыя ў інтэр’ер храма.

Галоўны заходні фасад касцёла быў вырашаны як шырокі, але неглыбокі аб’ём нартэкса, які меў ярусную будову. Ярусы падзяляліся паміж сабой развітымі прафіляванымі карнізамі. Другі “атыкавы” ярус закрываў тарэц даха галоўнага нефа і завяршаўся своеасаблівай трохвежавай кампазіцыяй. Сіметрычныя чацверыковыя вежы па баках фасада мелі складанае завяршэнне ў стылістыцы несапраўднай готыкі. Сярэдняя больш нізкая вежачка складалася з двух чацверыкоў з традыцыйным шатровым пакрыццём. На фасадзе на ўзроўні хораў знаходзіўся балкончык для музыкаў з разьбянай агароджай. Вежы і балкончык разабраны пры рэканструкцыі храма пад царкву. У 1906–1908 гг. над аздобай інтэр’ера працаваў вядомы мастак з Піншчыны Францішак Бруздовіч. Захаваўся яго малюнак святыні таго часу. Мастаком выкананы выключныя па мастацкіх якасцях арнаментальна-дэкаратыўныя роспісы касцёла, Столь, сцены, слупы, бэлькі – усе драўляныя канструкцыі будынка – цалкам былі пакрыты шматкаляровым квяцістым дываном з выявамі мясцовай флоры. І. Жыскар, складальнік вядомага даведніка “Nasze kościoły: Djecezja Mińska”, адзначыў, што “цімкавіцкі касцёл багаццем фарбаў, эстэтычнай гармоніяй, жывой гульнёй паліхроміі стаў для Літвы і Белай Русі тым жа, чым стаў касцёл францысканцаў, аформлены Станіславам Выспяньскім, для Кракава” [11].

Рэпрэзентатыўны архітэктурны тып каталіцкай базілікі у часы позняга барока атрымаў таксама пашырэнне ў грэка-каталіцкім храмабудаўніцтве Беларусі, што надало драўляным базілікам яшчэ больш самабытных этнаграфічных рысаў [12]. Уніяцкая царква “Старая каля Ляхаў” (б. Лідскі павет, цяпер Пружанскі р-н) вядома па фотаздымку канца XIX ст. Гэтая драўляная класічная базіліка з прамавугольным планам пабудавана ў канцы XVIII ст. Цэнтральная нава з верхнім бакавым асвятленнем была накрыта двухсхільным дахам з франтонамі на тарцах, бакавыя навы – аднасхільнымі. Над

галоўным фасадам мясцілася сігнатурка. Па баках прэсбітэрыя ў адну лінію з навамі ўкампанаваны невысокія выцягнутыя прамавугольныя ў плане сакрыстыі з аднасхільнымі дахамі. Уваход быў аформлены васьміграннай крухтай-экзанартэксам “сармацкага” тыпу, які зроблены аднолькавай вышыні з сакрыстыямі і накрыты шатровым дахам. Шалёўка сцен вертыкальная, вокны з паўцыркульнымі арачнымі завяршэннямі.

Уніяцкая Пакроўская царква ў в. Ганчары (Лідскі р-н) пабудавана ў 1774 г. (*іл. 2*).

У XIX ст., пасля забароны уніяцтва, перададзена праваслаўным і ў 1878 г. нанава асвячона пасля капітальнага рамонту (зроблены новы іканастас). Паводле архітэктонікі, гэта гарманічная і строгая класічная трохнававая базіліка з прамавугольным алтарным зрубам, які працягвае цэнтральную наву. Абапал алтарнага зруба



*Іл. 2. Ганчары. Лідскі р-н. Пакроўская царква. 1774*

ўкампанаваны квадратныя ў плане сакрыстыі. Мастацкі акцэнт зроблены на ўваходнай частцы будынка, у вырашэнні якой арыгінальна злучаны вузкі ўнутраны нартэкс з музычнымі харамі і вонкавы экзанартэкс у выглядзе трох'яруснай чацверыковай вежы з гранёным купалком і крыжам. Захавалася традыцыйная вертыкальная шалёўка сцен. Унутры тры пары калон вылучаюць цэнтральную наву, перакрытую корабавым скляпеннем з двухсхільным дахам. Даволі высокія бакавыя навы маюць плоскія столі і накрыты аднасхільнымі дахамі. Асобна па восі ўвахода пастаўлена двух'ярусная чацверыковая званіца, накрытая шатром-"каўпаком".

Уніяцкая Міхайлаўская царква ў в. Сцяпанкі (Жабінкаўскі р-н) пабудавана ў 1780 г. у стылі позняга беларускага барока. Архітэктоніка гэтай святыні дакладна паўтарае мураваную лацінскую трохнававую базіліку з дзвюхвежавым галоўным фасадам. Прамавугольная ў плане пабудова падзелена ў падоўжным напрамку на тры навы і мае класічнае базілікальнае папярочнае сячэнне з верхнім асвятленнем цэнтральнай навы невялікімі вокнамі. Алтарная частка вылучана прамавугольным выступам цэнтральнай навы, а вузкі нартэкс-бабінец – 2 калонамі, на якія абапіраюцца музычныя хоры. Шырыня нартэкса абумоўлена параметрамі чацверыкоў вежаў, што фланкуюць галоўны фасад. Вертыкальную экспрэсію вежаў падкрэслівае чляненне іх прычолкамі на два ярусы, якія змяншаюцца ўгору па вышыні – прыём характэрны для мясцовай муранай архітэктуры віленскага барока. Тарэц даха на галоўны фасадзе закрывае заглыблены франтон з шырокім прычолкам. Усю выцягнутую падоўжную кампазіцыю, падобную да марскога лайнера, вянчаюць тры фігурныя барочныя "банькі" з крыжамі, сімвалізуючы Святую Тройцу. Вокны бакавых наваў маюць барочныя лучковыя завяршэнні і прафіляваныя ліштвы, а сцены – традыцыйную вертыкальную шалёўку з нашчыльнікамі. Характэрна, што базілікальная структура сцяпанкаўскай Міхайлаўскай царквы за-



*ISSN 2523-4234 Історія релігій в Україні: наук. щорічн., 2018, Вип. 28, Ч. ІІ.*

снавана ўсяго на чатырох калонах, крыху зрушаных да ўваходнай частцы кафалікона. Пры гэтым две заходнія калоны прасторава вылучаюць бабінец і хоры, а две другія дзеляць малітоўную залу роўна пасярэдзіне. Мастацкая цэласнасць кампазіцыі храма была парушана пасля перадачы яго праваслаўным і рэканструкцыі ў 1858 г. Да галоўнага фасада прыбудавалі вялізны экзанартэкс-прытвор з псеўдабазілікальным сячэннем, які ў пачатку XX ст. быў завершаны двух'ярускнай васьмерыковай вежай з высокім шатром і цыбулістай галоўкай.

Грэка-каталіцкая царква св. Ануфрыя ў вёсцы Агароднікі (Камянецкі р-н) пабудавана ў 1782 г. у стылі барока. Мае структуру трохнававай базілікі без верхняга асвятлення. Аднасхільныя дахі бакавых наваў падведзены пад карніз цэнтральнага нефа. Будынак мае вертыкальную шалёўку з нашчыльнікамі і сцяжкамі-"лісіцамі", вокны з паўцыркульнымі завяршэннямі. Унутраная прастора падзелена апорнымі слупамі, над уваходам размешчаны музычныя хоры. У 2-й палове XIX ст. да галоўнага фасада прыбудавана невысокі прытвор з двух'ярускнай чацверыковай вежай над ім, накрытай высокім шатром.

Уніяцкая царква св. Параскевы Пятніцы ў вёсцы Опаль (Іванаўскі р-н) пабудавана ў 1796 г., у 1841 перададзена праваслаўным (*іл. 3*). Архітэктоніка храма дакладна імітуе формы мураванай трохнававай базілікі з класічным базілікальным папярочным сячэннем. Прамавугольная цэнтральная нава накрыта двухсхільным дахам з трохвугольнымі франтонамі на тарцах і невялікай вежачкай з фігурным купалком над алтаром. Бакавыя навы з аднасхільнымі дахамі завяршаны з боку алтара вялікімі сакрыстыямі са скошанымі сценамі, што ўзбагачае пластыку будынка. З боку галоўнага фасада бакавыя навы раней завяршаліся двума сіметрычнымі чацверыковымі вежамі, а цэнтральная – заглыбленым уваходным васьмікалонным парталам. Пазней вежы былі знятыя, а партал пераўтвораны ў нартэкс, закрыты агульнай вертыкальнай шалёўкай з нашчыльнікамі. Сцены бакавых наваў прарэзаны высокімі



*Іл. 3. Опаль. Іванаўскі р-н. Царква св. Параскевы Пятніцы. 1796*

прамавугольнымі вокнамі, а цэнтральнай – паўцыркульнымі люнетамі. Інтэр'ер падзелены 4 слупамі на тры навы, яшчэ два слупа падтрымліваюць музычныя хоры над уваходам. З хорамі аб'яднаны галерэі-эмпоры, якія праходзяць па верху бакавых наваў. Відавочна, што архітэктоніка і мастацкі вобраз разгледжаных грэка-каталіцкіх базілік зусім не адрозніваецца ад узору касцёлаў.

У 1723 г. у в. Блонь (Пухавіцкі р-н) на сродкі Язэпа Бака быў пабудаваны касцёл місіі езуітаў, які пацярпеў ад пажару ў 1820 г. і быў істотна перабудаваны да 1826 г. у стылі класіцызму. Пасля скасавання ордэна ў межах Расійскай імперыі быў закрыты і перададзены праваслаўным, адрамантаваны і асвечаны як Троіцкая царква ў 1873 г. Паводле архітэктонікі, гэта трохнававая крыжовакупальная базіліка лацінскага тыпу, увенчаная на сяродкрыжжы вялікім васьміграннным светлавым барабанам, які накрыты самкнутым купалам. Галоўны фасад вырашаны ў выглядзе класіцыстычнага порціка з чатырма папарна згрупаванымі мураванымі калонамі,

які завершаны масіўным атыкам і васьмерыковай вежай з купалам і высокім спічаком, што надае збудаванню рысы ампіра. Сцены ашаляваны гарызантальна і дэкарыраваны прафіляваным карнізам з сухарыкамі, а таксама накладнымі ордэрнымі пілястрамі, якія на тарцах трансепта імітуюць порцікі. У інтэр'еры 10 мураваных калон вылучаюць бакавыя навы і нартэкс, над якім былі размешчаны музычныя хоры. Аснова светлавога барабана аздоблена разьбяной агароджай. Алтарны праём аформлены фігурнай аркай. У архітэктуры помніка, якая спалучае рознастылявыя і рознаканфесійныя рысы, адлюстравана складаная гісторыя яго існавання.

Актывізацыя новага будаўніцтва драўляных касцёлаў тыпу базілікі адбылася ў міжваенны перыяд, у часы 2-й Рэчы Паспалітай, што выявілася ў адметных тэндэнцыях стварэння мастацкага вобраза помнікаў, дзе часам дамінавалі архітэктурныя традыцыі розных рэгіёнаў Польшчы. Замест бязвежавых ці дзвюхвежавых базілік часоў барока сталі пераважаць аб'ёмна-прасторавыя кампазіцыі з адной магутнай вежай над бабінцам. У асіметрычным размяшчэнні частак традыцыйнай сакральнай структуры храмаў назіраюцца праявы стылю мадэрн. Аднім з ініцыятараў пашырэння ў міжваенны перыяд у сакральным дойлідстве Заходняй Беларусі так званага закапаньскага стылю, які імітаваў архітэктурныя формы драўляных храмаў прыкарпацкага рэгіёна, стаў віленскі архітэктар Ю. Клос, паводле праекту якога ў 1923–1925 гг. пабудаваны касцёл Маці Божай Анёльскай у Мяжанах (Браслаўскі р-н), знішчаны пажарам у 1985 г. Характэрныя прыкметы закапаньскага стылю (ад горада Закапане на самым поўдні Польшчы, дзе ў XVII ст. сыходзіліся межы Рэчы Паспалітай, Аўстра-Венгерскай і Асманскай імперый) – клінчатыя гонтавыя дахі з пластычным прагібам схілаў, больш высокія за традыцыйныя беларускія, шырокія гонтавыя прычолкі ў некалькі ярусаў, наяўнасць вежы-вестверка на галоўным фасадзе і абхадных галерэй-апасаней, што візуальна імітавалі бакавыя навы. Касцёл

ў Мяжанах быў не базілікай, а двухзрубавым клецевым храмам, абкружаным галерэяй з шырокім гонтавым прычолкам.

Ацалеўшы да нашага часу драўляны Крыжаўзвіжанскі касцёл ў г. Баранавічы, пабудаваны ў 1924–1925 гг. (арх. Л. Жаландкоўскі), сумяшчае рысы неаготыкі і мадэрна з характэрнымі элементамі польскага манументальнага дойлідства. Аснову складае класічная трохнававая базіліка з верхнім асвятленнем. Цэнтральную наву па тарцах завяршаюць больш нізкая пяціграннная апсіда прэсбітэрыя і невялікі прамавугольны аб'ём нартэкса, які ўвенчвае васьміграннная вежа. Дынамічнае завяршэнне вежы складаецца з гранёнага купала, скразнога металічнага ліхтарыка і высокага шатра-спічака. З поўдня да прэсбітэрыя прылягае вялікая асіметрычная сакрыстыя гранёнай формы. Усе аб'ёмы маюць самастойныя высокія шматсхільныя дахі, над цэнтральным нефам і прэсбітэрыем з востравугольнымі люкарнамі. Інтэр'ер падзелены шасцю парамі калон на тры навы, перакрытыя плоскімі столямі.

Станаўленне архітэктурнай плыні нацыянальнага рамантызму звязана з імем архітэктара Лявона Вітан-Дубейкаўскага, які тэарэтычна і практычна імкнуўся зразумець і захаваць дух айчыннай гісторыі і культуры. Яго першы праект 1916 г. касцёла ў Янатрудзе (б. Полацкі павет) не быў рэалізаваны, з-за катастрафічных падзей 100-гадовай даўніны. Аднак свае асноўныя ідэі архітэктар рэалізаваў у 1927–1929 гг. пры будаўніцтве велічнага Петрапаўлаўскага касцёла ў Дрысвятах (Браслаўскі р-н) (*іл. 4*). Святыня пастаўлена на старажытным замчышчы над возерам Дрысвяты, на мураваным з расколатых валуноў подыюме, адкуль, як лічыў архітэктар, "відаць прапорцыі паасобных частак, якія ствараюць маналітную, манумэнтальную форму, нагадваючы нам Беларускі стыль" [13]. Будынак мае строгую рацыянальную структуру традыцыйнай трохнававай базілікі з пяціграннным прэсбітэрыем, сіметрычнымі бакавымі сакрыстыямі і вузкім унутраным нартэксам. Аднак вонкавы мастацкі вобраз збудавання з ускладнёнай пластыкай форм мае некалькі чужародныя рысы за-



*Іл. 4. Дрысвяты. Браслаўскі р-н. Петрапаўлаўскі касцёл. 1927–1929*

капаньскага стылю: пяці'ярусная вежа-вестверк, надзвычай шырокі прычолак з прагібам, падперты на галоўным фасадзе чатырма калонамі, высокі дах з заломам, больш нізкі за асноўны вільчык даха над прэсбітэрыем і інш.

Касцёл Маці Божай Ласкавай ў Крэва (Смаргонскі р-н), пабудаваны ў 1934–1936 гг. у сувязі са святкаваннем 650-годдзя Крэўскай уніі (арх. П. Стаброўскі, Ф. Норбскі), быў самай вялікай па памерах драўлянай трохнававай базілікай таго часу, што мела ў даўжыню каля 30 м і ў шырыню (у межах трансепта) звыш 15 м. Стылістычна архітэктура збудавання была вытрымана ў формах неабарока, што выяўлена ў дзьвюхвежавым вырашэнні галоўнага фасада з заглыбленым фігурным франтонам. У 1961 г. касцёл зачынены, зняты стромкія чацверыковыя вежы,

надбудаваны бакавыя навы. У будынку дзейнічае ўрачэбная амбулаторыя.

У канцы 1930-х гг. былі рэалізаваны праекты яшчэ шэрагу драўляных базілік: касцёл у в. Хаценьчыцы Вілейскага павета (1937, арх. Я. Бароўскі, Л. Фаркевіч) з асіметрычна пастаўленай вежай тыпу кампаніле, касцёл св. Станіслава ў в. Далёкія на Браслаўшчыне (1934) і касцёл Маці Божай Вострабрамскай ў Дайлідках на Астравеччыне (1938) – два апошнія маюць магутныя чацверыковыя вежы над бабінцамі, увенчаныя купаламі-“банямі”. Іх архітэктура ў цэлым адлюстроўвае эклектычныя пошукі нацыянальнага стылю ў спалучэнні з павевамі мадэрна і ідэалагічным дамінаваннем традыцый польскай культуры. Архітэктоніка драўлянай базілікі ўспрымалася дойлідамі таго часу як базавы архетып каталіцкага храмабудаўніцтва ў Беларусі, але, па-большасці, яна аранжыравалася запазычанымі і стылізаванымі мастацкімі формамі польскага дойлідства.

З разгледжанага вышэй відавочна, што драўляныя базілікі і колькасна, і якасна ствараюць значную і адметную групу беларускіх хрысціянскіх святынь. Аднак гэты самабытны тып сакральнага дойлідства Беларусі раней ніколі не вылучаўся ў айчынным мастацтвазнаўстве як асобны і самастойны. Як сведчыць мастацтвазнаўчы аналіз, гэты архітэктанічны тып драўлянага храмабудаўніцтва з’яўляецца вынікам кардынальнага ўплыву на яго прафесійнай мураванай архітэктуры з выяўленай ідэалагічнай праграмай каталіцызма і эстэтычнай канцэпцыяй стылю барока. Больш таго, менавіта ён сфарміраваў мастацкія крытэрыі агульнай базілікальнай канцэпцыі, уласцівай традыцыйным беларускім драўляным храмам часоў барока.

1. Тарас Я. Українська сакральна дерев’яна архітектура. Львів: Інститут народознавства НАН Украïны, 2006. С. 471–493.

2. Габрусь Т. В. Мураваныя харалы: Сакральная архітэктура беларускага барока. Мінск: Ураджай, 2001. С. 46–60.

3. Габрусь Т. “Сармацкае” барока ў архітэктуры Беларусі // Мастацтва. 2000. № 1. С. 45–54.

4. Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis vilnensis. Vilnae, 1936. S. 85.

5. Навуковая бібліятэка Вільнюскага універсітэта, г. Вільнюс. Аддзел рукапісаў (далі – НБ ВУ. АР.). Ф. 4. Спр. 2170.

6. Каталіцкія святыні: Мінска-Магілёўская архідыяцэзія / тэкст і фота А. Яроменкі. Мінск: Про Хрысто, 2003. Ч. 1. С. 47.

7. НБ ВУ. АР. Ф 4. Спр. 2877.

8. Ossendowski A. Polesie. Cuda Polski. Poznań, 1934. S. 46.

9. Расійскі Дзяржаўны архіў старажытных актаў, г. Масква. Ф. 2188. Воп. 1. Спр. 36. Л. 1–1 адв.

10. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі, г. Гродна. Ф. 8. Воп. 1. Спр. 1223.

11. Nasze kościoły. Djecezja Mińska / pod red. J. Żyskara. Warszawa – Petersburg, 1912–1913. T. 1/2. S. 261; Страчаная спадчына / уклад. Т. В. Габрусь. Мінск: Полымя. 1998. С. 153–156.

12. Габрусь Т. В. Сакральнае дойлідства Беларусі: 1000-гадовая спадчына = Сакральное зодчество Беларуси: 1000-летнее наследие = The Sacral Architecture of Belarus: Millennial Legacy. Мінск: Беларуская навука, 2014. Драўляныя шэдэўры, № 47. С. 306; № 50. С. 309; № 53. С. 312; № 69. С. 328; № 81. С. 340.

13. Харэўскі С. В. Культавае дойлідства Заходняй Беларусі 1915–1940 гг. Вільня: Выдавецтва ЕГУ, 2008. С. 60−67.